# С Т А Т У Т

## БЕЛАРУСКАЙ КАТАЛІЦКАЙ ГРАМАДЫ

### І. Мэта, прызначэньне і прынцыпы дзейнасьці

І. Беларуская Каталіцкая Грамада /далей — БКГ/ грамадская, асьветна-культурнае хрысьціянскае згуртаваньне, якое яднае беларусаў рыма-каталіцкага веравызнаньня з мэтай вяртаньня беларускага народа на шляхі цывілізацыі праз:

а/ адраджэньне свайё дзяржаўнасьці на хрысьціянскіх ідэалах;

б/ беларусізацыю рэлігійнага жыцьця народа;

в/ вяртаньне роднай мовы ў касьцёлы;

г/ абарону інтарэсаў католікаў, абуджэньне іх актыўнасьці, свядомасьці і ўмацаваньня патрыятызму;

д/ змаганьне супраць дэнацыяналізацыі за кансалідацыю беларускага народа;

е/ пашырэньне асьветніцкай дзейнасьці ў асяроддзі католікаў на Беларусі;

ж/ спрыяньне праўдзіваму адлюстраваньню гісторыі хрысьціянства на Бацькаўшчыне і прапаганду багатых традыцый беларускамоўных набажэнстваў XIУ—XX стст.;

з/ вяртаньне беларусам-католікам касьцёлаў, кляштараў, будынкаў былых навучальных рэлігійных установ, збудаваных нашымі продкамі на тэрыторыі Беларусі;

і/ спрыяньне ўтварэньню беларускіх рэлігійных навучальных установ;

к/ садзейнічаньне стварэньню беларускага хрысьціянскага Універсітэта;

л/ спрыяньне Утварэньню каталіцкіх згуртаваньняў беларускіх дзяцей і юнацтва /моладзі/.

2. БКГ дзейнічае на падставах публічнасьці і адкрытасьці, інфармаванасьці і зваротнай сувязі; раўнапраўя ўсіх сяброў; выбарнасьці і справаздачнасьці ўсіх выбарных органаў.

3. БКГ папулярызуе помнікі архітэктуры нацыянальнага дойлідства наглядае за іх станам і клапоціцца пра аднаўленьне і пабудову новых.

4. БКГ адпаведна сваім мэтам і прызначэньню наладжвае дыскусіі, абмеркаваньні, мірныя маніфестацыі, распаўсюджвае інфармацыю, ладзіць выставы, канцэрты і г.д.

5. БКГ можа мець свае друкаваныя органы і іншыя сродкі масавай інфармацыі.

6. Для дасягненьня сваіх мэтаў і выкананьня свайго прызначэньня БКГ можа мець і ствараць выдавецтвы, друкарска-паліграфічныя, мастацка-прамысловыя, рэстаўрацыйна-будаўнічыя майстэрні і іншыя гаспадарча-разліковыя структуры.

7. БКГ у адпаведнасьці з дадзеным Статутам супрацоўнічае з дзяржаўнымі органамі, рэлігійнымі і іншымі аб"яднаньнямі БССР, СССР і сьвету.

8. БКГ дзейнічае на тэрыторыі Беларускай ССР і мае прадстаўніцтва ў іншых рэспубліках, краінах. Сваю дзейнасьць БКГ ажыцьцяўляе ў адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР, Канстытуцыяй СССР, дзейснага заканадаўства і дадзенага Статута.

9. БКГ валодае правам заканадаўчай ініцыятывы ў Вярхоўным Савеце БССР.



10. БКГ і яе мясцовыя структуры могуць вылучаць кандыдатаў у народныя дэпутаты ў адпаведнасьці з Законам Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб выбарах народных дэпутатаў Беларускай ССР і законам Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб выбарах народных дэпутатаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў Беларускай ССР.

11. БКГ і яе структуры зьяўляюцца юрыдычнымі асобамі, яны маюць пячатку, бланк, рахункі ва ўстановах банкаў /у рублях і валюце/, сваю сімволіку /сьцяг, эмблему, вымпел, значок і г.д./, якія рэгіструюцца ў устаноўленым законам парадку.

БКГ прызнае беларускую нацыянальную сімволіку.

Юрыдычны адрас кіраўнічага органа: 220113, Мінск, Усходняя 54-213.

## 2. Сяброўства БКГ

12. Сябрам БКГ можа быць любы беларус-каталік, грамадзянін БССР, іншай рэспублікі ці дзяржавы, або асоба без грамадзянства, якая дасягнула 18-гадовага ўзросту, прызнае Статут БКГ і выконвае яго патрабаваньні, знаходзіцца ў ліку ў БКГ, плаціць сяброўскія складкі /узносы/ і падтрымлівае БКГ асабістай дзейнасьцю.

13. Прыём да шэрагу сяброў БКГ адбываецца на падставе пісьмовай заявы-анкеты кандыдата ў яго прысутнасьці на пасяджэньні пярвічнага згуртаваньня.

14. Сябры БКГ маюць права:

— абіраць і быць абранымі ва ўсе органы БКГ;

— дабраахвотна удзельнічаць у справах БКГ;

— браць удзел ва ўсіх сходах і мерапрыемствах БКГ;

— атрымліваць падтрымку ад органаў БКГ у выпадку неабходнасьці абараніць свае правы ці законныя інтарэсы;

— абмяркоўваць усе пытаньні па дзейнасьці БКГ, выказваць думку аб іх неабходнасьці ці крытыкаваць іх;

— выйсці па свайму жаданню з шэрагаў сяброў БКГ.

15. Сябры БКГ абавязаны:

— выконваць патрабаваньні дадзенага Статута і рашэньні выбарных органаў;

— несьці адказнасць за выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў перад БКГ і яе сябрамі;

— весці работу па прапагандзе мэтаў і прызначэньня БКГ і падтрымліваць яе аўтарытэт;

— пацьвярджаць сваё сяброўства уплатай штомесячнай складкі.

16. Сябры БКГ выключаюцца з арганізацыі ў выпадку непадпарадкаваньня рашэньням выбарных органаў або парушэньня статутных палажэньняў рашэньнем пярвічнага згуртаваньня.

17. Выключаныя з БКГ не маюць права прэтэндаваць на ўзносы, ахвяраваньні і г.д., якія былі ўнесены ў БКГ.

3. Структура БКГ

18. Вышэйшы орган БКГ — Сойм, які склікаецца не радзей аднаго разу ў два гады.

Сойм:

— выпрацоўвае праграму дзейнасьці БКГ;

— зацьвярджае Статут БКГ, уносіць у яго зьмены і дадаткі;



— абірае Раду і Рэвізійную камісію;

— абірае старшыню БКГ і яго намесьнікаў;

— заслухоўвае справаздачу Рады і Рэвізійнай камісіі;

— ацэньвае іх дзейнасьць;

— выбірае галоўнага рэдактара друкаванага органа;

— разглядае іншыя пытаньні дзейнасьці БКГ.

19. Рашэньне Сойма прымаюцца простай большасьцю галасоў. Форма галасаваньня прымаецца Соймам.

20. Нячарговы Сойм праводзіцца па ініцыятыве не менш чым 1/3 сяброў БКГ ці Рады БКГ ці Рэвізійнай камісіі.

21. Кіруючым органам БКГ у перыяд паміж Соймам з'яўляецца Рада.

— работай Рады кіруе старшыня БКГ;

— паседжаньні Рады праводзяцца па неабходнасьці, але не радзей 1 разу на 3 месяцы.

22. Рада БКГ:

— арганізоўвае выкананьне рашэньняў Сойму;

— уносіць зьмены і дапаўненьні ў Статут з наступным вынясеньнем на Сойм;

— зацьвярджае бягучыя планы работы і каштарыс;

— вызначае квоту на Сойм дэлегатаў;

— рашае пытаньні аб утварэньні гаспадарча-разліковых структур, зацьвярджае іх Статуты /палажэньні/;

— разглядае іншыя пытаньні дзейнасьці БКГ.

— зацьвярджае ўзоры пячаткі, штампа, бланка, эмблемы і г.д.

23. Аснова БКГ — пярвічныя згуртаваньні, якія утвараюцца з трох і больш чалавек па месцы жыхарства:

— гарадскія і раённыя аддзяленьні — з трох і больш пярвічных згуртаваньняў,

— абласныя аддзяленьні і аддзяленні г. Мінска /якое прыраўніваецца да абласнога/ — з трох і больш гарадскіх ці раённых згуртаваньняў.

24. Формы работы і структуры абласных, раённых, гарадскіх аддзяленняў і пярвічных згуртаваньняў вызначаюцца на сходах гэтых фарміраваньняў.

25. Рэвізійная камісія БКГ:

— вызначае адпаведнасьць дзейнасьці ўсіх органаў БКГ, яе структур і асобных сяброў дадзенаму Статуту;

— кантралюе паступленне і выдаткі грашовых органаў і дзейнасьць заснаваных БКГ гаспадарчых арганізацый;

— разглядае спрэчныя пытаньні пра сяброўства ў БКГ;

— мае права быць ініцыятарам правядзеньня нечарговага Сойма.

Старшыня камісіі абіраецца яе сябрамі.

Пасяджаньні Рэвізійнай камісіі праводзяцца па неабходнасці, але не радзей як два разы на год.

Старшыня /ці яго прадстаўнік/ прымае ўдзел у пасяджэннях Рады з правам дарадчага голасу.

Сябры камісіі не могуць уваходзіць у склад Рады ці іншыя выбарныя органы.



4. Маёмасьць і фінансы БКГ

26. Маёмасьць БКГ складаецца праз набыцьцё ( гадарункі і іншыя формы ) дазволенае законам.

27. БКГ валодае фінансавымі сродкамі, якія складаюцца з узносаў, паступленьняў ад правядзеньня адпаведна Статута вечароў, продажу літаратуры, прыбыткаў ад створаных гаспадарчаразліковых структур, ахвяраваньняў асобных грамадзян і арганізацый Беларусі, іншых рэспублік і краін сьвету, з культурна-асьветніцкай і выдавецкай дзейнасьці і іншых не забароненых законам паступленьняў.

Пярвічныя арганізацыі і мясцовыя аддзяленні адлічваюць Радзе 25% ад узносаў і іншых паступленьняў.

5. Ліквідацыя БКГ

28. БКГ спыняе сваё існаваньне па рашэньню Сойма, калі за гэта прагаласуе 4/5 дэлегатаў, ці суда.

29. Маёмасьць, якая засталася пасьля пагашэння пазыкаў выкарыстоўваецца па рашэньню ліквідацыйнай камісіі на дабрачынную дзейнасьць у адпаведнасьці з дадзеным статутам.

30. БКГ не адказвае за пазыкі сваіх сяброў, усіх структураў, створаных гаспадарчаразліковых фарміраваньняў, таксама як тыя не адказваюць за пазыкі БКГ.

Прыняты на Устаноўчым Сойме БКГ

13 красавіка 1991 г.

Гип. – управления структуры ?

иерархия – ?